# "Каранямі дрэва моцна»

У рамках правядзення свята "Баранавіцкая вясна-2019" у аддзеле ЗАГС Баранавіцкага гарвыканкама 17 траўня 2019 года прайшло ўрачыстае мерапрыемства - "Каранямі дрэва моцна".

Гэтае свята было прысвечана пяці шлюбным парам, якія пражылі ў шчаслівым шлюбе 50, 55 і 60 гадоў.

Пары, якія пражылі шмат гадоў у шлюбе, лічаць, што заклад шчаслівага сямейнага жыцця-гэта паразуменне, ўзаемапавага і цярпенне.

Прысутныя на мерапрыемстве госці і родныя пажадалі сямейным парам здароўя, даўгалецця і абавязкова адзначыць соты юбілей сумеснага жыцця.

Кожная сям'я-юбіляр атрымала спецыяльныя медалі ад аддзела ЗАГС і абраз жонак-міраносіц ад настаяцеля храма святых жонак-міраносіц. Прысутная на мерапрыемстве Якубовіч Таццяна Раманаўна, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, цёпла і сардэчна павіншавала юбіляраў і ўручыла падарункі ад гарадской арганізацыі Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання "Белая Русь".



